УДК 929:[902+72+93/94](476)"195/20"

# ДА ДНЯ НАРАДЖЭННЯ А. А. ТРУСАВА



*7 жніўня споўнілася 60 гадоў Алегу Анатольевічу Трусаву – археолагу, гісторыку беларускай архітэктуры, таленавітаму выкладчыку, грамадскаму дзеячу – добра вядомаму сярод студэнтаў і выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.*

Алег Анатольевіч Трусаў нарадзіўся ў г. Мсціслаў Магілёўскай вобласці 7 жніўня 1954 г. У 1976 г. з адзнакай скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1976 г. з'яўляўся супрацоўнікам, а пазней – начальнікам археалагічнага аддзела Беларускага рэстаўрацыйнага праектнага інстытута, загадчыкам аддзела комплексных навуковых даследаванняў. У 1981 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVII стст. Гісторыка-археалагічны аналіз». Даследуючы дойлідства XI–XVIII стст., А. А. Трусаў распрацаваў методыку архітэктурна-археалагічнага вывучэння манументальных помнікаў Беларусі. Праводзіў археалагічныя раскопкі ў Лідзе, Міры, Крэве, Мазыры, Заслаў'і, Гародні, Віцебску, Наваградку, Магілёве, Мінску і іншых мясцінах Беларусі.

Алег Анатольевіч – адзін з аўтараў праекта па рэканструкцыі, рэстаўрацыі і аднаўленні гістарычнага цэнтра Мінска. З 1990 г. па 1995 г. з'яўляўся намеснікам старшыні камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і ахове гістарычнай спадчыны. У 2009 г. быў удзельнікам Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. А. А. Трусаў з'яўляецца адным з заснавальнікаў, а з 1999 г. старшынёй Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. А. Трусаў з 1995 г. працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. З 1996 г. па 1998 г. быў дэканам факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, стаў стваральнікам першых вучэбных планаў па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Сёння з'яўляецца дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства БДУКМ.

А. А. Трусаў распрацаваў і выкладае курсы «Археалогія», «Гісторыя архітэктуры», «Гісторыя матэрыяльнай культуры», «Гістарычнае краязнаўства», «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі», «Філатэлія Беларусі» і інш., кіруе падрыхтоўкай дыпломных работ і магістарскіх дысертацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Алег Анатольевіч – аўтар больш за 500 навуковых, навукова-папулярных публікацый у айчынных і замежных выданнях па праблемах матэрыяльнай культуры Беларусі і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Яго навуковыя інтарэсы датычацца складаных і часам практычна недаследаваных старонак беларускай гісторыі.

Манаграфіі і артыкулы А. А. Трусава прыцягальны для чытача лёгкім стылем напісання, глыбінёй і паслядоўнасцю разгляду акрэсленай праблематыкі. Сярод апошніх манаграфічных даследаванняў – «Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах» (Мінск, 2009; 2-е дапоўненае выданне на беларускай і англійскай мовах пабачыла свет у 2013), «Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне» (Магілёў, 2010), «Эстэтыка архітэктуры рэгіянальных музеяў» (Мінск, 2012), падрыхтавана да выдання «Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі (ад эпохі неаліту да 1991 г.)».

Алег Анатольевіч вельмі добразычлівы і адкрыты да людзей чалавек, шчаслівы бацька і дзядуля. Выкладчыкі і супрацоўнікі кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства заўсёды могуць атрымаць у яго кансультацыю і добрую параду. За адданасць сваёй прафесіі, глыбокія і рознабаковыя веды шчыра паважае і любіць свайго выкладчыка студэнцкая моладзь універсітэта.

Ад ўсяго сэрца калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў віншуе Алега Анатольевіча з юбілеем і жадае моцнага здароўя, творчага настрою, здзяйснення задум, новых адкрыццяў у беларускай гісторыі і плённай працы на карысць нашчадкаў і краіны!

## СПІС АСНОЎНЫХ РАБОТ А. А. ТРУСАВА І ЛІТАРАТУРЫ ПРА ЯГО

### *Працы А. А. Трусава*

1. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. Архитектурно-археологический анализ / О. А. Трусов. – Минск : Навука і тэхніка, 1988. – 160 с.

2. Старонкі мураванай кнігі: Манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму / А. А. Трусаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 190 с.

3. Беларускае кафлярства / А. А. Трусаў ; М-ва культуры Респ. Беларусь, Беларус. ін-т праблем культуры. – Мінск, 1993. – 49 с.

4. Рэйнскі каменны посуд у Беларусі / А. А. Трусаў // Беларуска-нямецкае грамадска-культурнае ўзаемадзеянне: гісторыя, сучаснасць, перспектывы. – Мінск : Нац. навук.-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны, 1996. – С. 11–12. – (Беларусіка = Albaruthenica ; кн. 7).

5. Матэрыяльная культура Крэўскага замка / А. А. Трусаў // З глыбіні вякоў. Наш край : гіст.-культ. зб. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – Вып. I. – С. 212–228.

6. Матэрыяльная культура беларускага горада ў гады Вялікага Княства Літоўскага / А. А. Трусаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. – № 3. – С. 56–59.

7. Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стст. Гісторыя будаўнічай тэхнікі / А. А. Трусаў. – Мінск : Лекцыя, 2001. – 204 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Месца і роля беларускай мовы ў працэсе станаўлення і развіцця беларускай нацыянальнай ідэі / А. А. Трусаў // Янка Купала і праблемы беларускага самапазнання : V Міжнар. Купалаўскія чытанні : навук. канф., Мінск, 7–8 снеж. 2000 г. / уклад. А. Бурбоўская ; рэдкал.: Ж. Дапкюнас [і інш.]. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2002. – С. 183–186.

9. Сінагогі і мячэці Гродзеншчыны / А. А. Трусаў // Культура гродзенскага рэгіёна: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа : зб. навук. прац / рэд. А Пяткевіч ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гродзенскі дзярж. ун-т імя Я. Купалы. – Гродна, 2003. – С. 264–267.

10. Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах / А. А. Трусаў. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 152 с.

11. Археалогія помнікаў архітэктуры / А. А. Трусаў // Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. – Т. 1 : А–К. – С. 52–53.

12. Віцебская архітэктурная школа / А. А. Трусаў // Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1 : А–К. – С. 170.

13. Гродзенская архітэктурная школа / А. А. Трусаў // Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1 : А–К. – С. 261–262.

14. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне / А. А. Трусаў, А. Р. Агееў. – 2-е выд., папраўл. і дап. – Магілёў : Магілёўс. абл. узбуйн. друк., 2010. – 160 с.

15. Эстэтыка архітэктуры рэгіянальных музеяў / А. А. Трусаў // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2012. – № 1(17). – С. 142–148.

***Артыкулы аб А. А. Трусаве***

1. Трусаў Алег Анатольевіч // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / рэд. А. А. Воінаў. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 606.

2. Трусаў Алег Анатольевіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 614.

3. Трусаў Алег Анатольевіч // Беларусь : энцыкл. давед. / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 706.

4. Трусаў Алег Анатольевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск : БелЭн, 2002. – Т. 15. – С. 538.

5. Алег Анатольевіч Трусаў // Вікіпедыя : свабодная энцыкл. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Алег_Анатольевіч_Трусаў. – Дата доступу: 31.10.2014.

6. Трусов Олег Анатольевич // Википедия : свободная энцикл. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Трусов,_Олег_Анатольевич. – Дата доступа: 31.10.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ